Источник: "Звязда" - 2019-08-15

Юбілейны генетычны пашпарт

У Рэспубліканскім цэнтры геномных біятэхналогій Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі такія дакументы для жыхароў Беларусі і іншых краін складаюцца з 2010 года. 14 жніўня Інстытут генетыкі чакаў свайго 15-тысячнага кліента.

Генетычны пашпарт — гэта дакумент, у якім прыводзяцца звесткі аб генетычных асаблівасцях чалавека. Менавіта гены ў вялікай ступені адказныя не толькі за нашу знешнасць і здольнасці, але і за наша здароўе. Таму вельмі важна вызначыць, да якіх захворванняў у чалавека ёсць схільнасць, асабліва калі яны залежаць не толькі ад генаў, але і ад ладу жыцця. Калі такая схільнасць выяўлена, можна правесці прафілактыку і прадухіліць хваробу.

У цэнтры праводзіцца тэсціраванне на генетычную схільнасць да сардэчна-сасудзістых захворванняў, дыябету, астэапарозу, метабалічнага сіндрому. Тэсціруюцца і спартсмены для выяўлення спрыяльных і неспрыяльных для спорту генетычных асаблівасцяў. Найбольш запатрабаваная паслуга — выяўленне генетычных прычын невынашвання цяжарнасці. Большая частка генетычных пашпартоў выдадзена жанчынам менавіта з гэтай праблемай.

Генетычны аналіз у тым ліку дазваляе вызначыць індывідуальную адчувальнасць да лекаў. Лабараторыя генетыкі чалавека Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН адзіная ў СНД мае міжнародную акрэдытацыю ў галіне генетычнага аналізу.

Сяргей РАСОЛЬКА.